# УЗБРОІЦЬ ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА МЭХАНІЗМАМІ

# БРАК НЕ ВЫПУСКАЦЬ ЗА ВАРОТЫ ЗАВОДУ!

## З выступленьня сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало на ўсебеларускай нарадзе па дарожнаму будаўніцтву

Ахарактарызаваўшы гаспадарча-палітычную важнасьць дарожнага будаўніцтва, тав. Гікало дае падрабязны аналіз становішча з падрыхтоўкай да будаўніцтва.

— Калі меркаваць толькі па лічбах,— гаворыць тав. Гікало,—дык справа стаіць быццам ня так ужо дрэнна. Заключаны дагавары на 73 проц. рабочых. Каменьня падвезена да месца работ на 66 проц. Супроць мінулага году тут вялікія дасягненьні. Але, адна справа, калі гэта запісана на паперы, другая справа—у сапраўднасьці. Вельмі часта, калі дакладваюць, малюнак прадстаўляецца бліскучым, а калі праверыць—на справе ня зусім так. Прыведзеныя мною лічбы найбольш блізкі да ісьціны. Аднак, трэба кожнаму з нас у паасобку і нам тут таксама праверыць ці ўсё гэта так, ці няма тут перапавялічэньняў, ці няма «очковтирательства». Трэба праверыць, ці замацавана гэта работа.

Дрэнна з гравіем і пяском. Загатоўлена ўсяго 6-10 проц. пляну. Гэта паказвае, што неабходных бальшавіцкіх тэмпаў у гэтай рабоце няма.

Тав. Гікало заастрае ўвагу нарады на пытаньні асваеньня мэханізмаў і выкарыстаньня іх, з чым у нас справа пастаўлена далёка не на належную вышыню. Так, 5 дарбудвучастак камяндрабілкі выкарыстоўвае толькі на 50-60 проц., прычым продукцыйнасьць працуючых машын не перавышае 50 проц. нормы.

Такое недапушчальнае становішча з выкарыстаньнем мэханізмаў тлумачыцца перш за ўсё адсутнасьцю належнай работы па асваеньню іх, па аўладаньню тэхнікай.

У бягучым годзе,—гаворыць тав. Гікало—мэханізмы павінны быць вынесены на першы плян нашай партыйна-масавай работы. Рад спраў паказвае, што там, дзе партыйна-масавая работа не разгорнута, ёсьць шмат хібаў, там уся работа ідзе слаба. Лепшым довадам гэтага зьяўляецца прыклад усім вам вядомай зембінскай справы. За пастаноўку партыйна-масавай работы павінны адказваць парторганізатары, сэкратары партыйных ячэек. Гэтага мы будзем патрабаваць з усёй рашучасьцю.

Мы патрабуем ад кожнага комуністага, кожнага партработнікэ дарожнага будаўніцтва бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну. Мы не дапусьцім ніякай расхлябанасьці, ніякага аслабленьня работы. Трэба вытруціць разважаньні аб тым, што, вось, моў, у нас атрымаўся прарыў, але мы яго як-небудзь паціхеньку выправім. Трэба па-бальшавіцку, моцна, не саромячыся, ставіць пытаньні, зьвязаныя з забясьпечаньнем выкананьня пляну. У пытаньнях барацьбы за соцыялістычнае будаўніцтва, за абарону краіны, за інтарэсы рабочае клясы, за бытавое абслугоўваньне яе—бальшавік павінен на любым вучастку змагацца так, як гэта падабае бальшавіку. Ня можа быць ніякіх спасылаваньняў на тое, што вось я-б сказаў, але баюся, што Іван Міхайлавіч пакрыўдзіцца, я-б сыгналізаваў, але баюся, што сэкратар адпаведнага партыйнага камітэту пакрыўдзіцца, я-б паставіў пытаньне, але баюся, што магчыма адпаведны кіраўнік ці загадчык пакрыўдзіцца. Гэтага не павінна быць, бо калі мы так будзем працаваць, дык мы не вырашым усіх тых задач, якія перад намі паставіла партыя.

Задача ў тым, каб набольш бываць на мясцох, ахапіць важнейшыя вучасткі работы, опэрацыйна кіраваць, выпраўляць недахопы, дапамагаць у выпраўленьні іх і г. д. Абавязак кожнага комуністага—паведамляць аб тым, што робіцца па мясцох.

Дзе-ні-дзе чутны галасы аб нерэальнасьці пляпаў. Гэта галасы опортуністых. Тое, што партыя намячае, можна выканаць. У гэтым мы пераканаліся хаця-б на вопыце выкананьня пляну лесазагатовак. Я памятаю, як некаторыя работнікі даводзілі, што плян лесазагатовак немагчыма выканаць. Аднак, калі мы рашуча паставілі пытаньне, калі мы прымусілі сапраўды, закасаўшы рукавы, па-бальшавіцку ўзяцца за работу, плян аказаўся магчымым. Тое-ж самае і ў пытаньні дарожнага будаўніцтва. Плян зусім рэальны. Уся справа ў тым, каб з бальшавіцкай упартасьцю ўзяцца за яго выкананьне.

Важнейшай умовай выкананьня пляну зьяўляецца ў першую чаргу рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна. У гэтым стрыжань пытаньня. Бяз гэтага наогул нельга працаваць.

Пара перабудавацца. Па-новаму працаваць,—гэта значыць менш пісаць рэзолюцый, больш часта бываць на мясцох, у масе, кіраваць опэрацыйна. І Цэнтральнаму Камітэту ў гэтых адносінах трэба яшчэ шмат чаго зрабіць. На важнейшыя вучасткі дарожнага будаўніцтва таксама, як на пасеўны, торфараспрацоўкі і г. д., павінны быць кінуты лепшыя сілы, павінен быць забясьпечан штодзённы опэрацыйны нагляд.

Канчаючы сваё выступленьне, тав. Гікало зварочваецца да ўдзельнікаў нарады—забясьпечыць баявое разгортваньне дарожнага будаўніцтва з тым, каб на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна поўнасьцю выканаць намечаны плян.

— Мы гэта можам зрабіць,—гаворыць тав. Гікало,—абавязаны і безумоўна зробім.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы